Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

10 СНЕЖНЯ 2009 г. ЧАЦВЕР № 47 (15601)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Прафтэхшкола

# ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ ПРАФЕСІЙНАЙ САМАРЭАЛІЗАЦЫІ МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ?

**Не сакрэт, што апошнім часам моладзь, асабліва сталічная, з пагардай ставіцца да рабочых прафесій. Прычым маладыя людзі падтрымліваюць у гэтым і іх бацькі. У Рэспубліканскім цэнтры прафарыентацыі моладзі заўважылі адну цікавую тэндэнцыю: даволі часта да іх на кансультацыі прыходзяць сем'і, у якіх бацькі маюць рабочыя прафесіі, многія займаюць на сваім прадпрыемстве ўжо кіруючыя пасады, і менавіта яны катэгарычна не хочуць, каб дзіця атрымала рабочую спецыяльнасць. Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама правёў апытанне сярод бацькоў мінскіх старшакласнікаў, падчас якога высветлілася, што ніхто з іх не хоча, каб іх дзіця паступала ў прафесійна-тэхнічную навучальную установу ці працавала на дзяржаўным прадпрыемстве. Нават сярод выпускнікоў такое жаданне было «заўважана» толькі ў 1 працэнта. Аднак нашай краіне патрэбныя не толькі перакладчыкі, юрысты, дызайнеры, псіхолагі, але і рабочыя самай высокай кваліфікацыі: слесары-рамонтнікі, каменшчыкі, токары, фрэзероўшчыкі, машынабудаўнікі. У вострым дэфіцыце на рынку працы таксама кухары, прадаўцы, вадзіцелі грамадскага транспарту...**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёлета сістэме прафтэхадукацыі, так бы мовіць, пашанцавала: колькасць выпускнікоў базавай школы, дзякуючы вяртанню да 11-годкі, павялічылася больш чым удвая. Таму нават з павелічэннем плана набору ўкамплектавацца ўдалося. Сярэдні конкурс на аснове базавай адукацыі склаў па краіне 1,26 чалавека на месца, а на аснове агульнай сярэдняй адукацыі — 1,08 чалавека на месца. Найбольш запатрабаванымі ў моладзі ў гэтым годзе, як, дарэчы, і ў папярэднія гады, аказаліся прафесіі цырульніка, аператара паштовай сувязі, кантралёра аддзялення банка (конкурс даходзіў да 3-4 чалавек на месца), слесара па рамонце аўтамабіляў (да 2 чалавек на месца) і кухара (1,5 чалавека на месца). Ва ўсіх абласцях добра камплектаваліся групы на аснове агульнай базавай адукацыі, асабліва прафесіі будаўнічага профілю (конкурс даходзіў да 2-3 чалавек на месца). У той жа час ва ўсіх рэгіёнах меліся пэўныя цяжкасці пры камплектаванні груп на аснове агульнай сярэдняй адукацыі, асабліва па прафесіях сельскагаспадарчага профілю, лёгкай прамысловасці, машынабудавання і металаапрацоўкі, а ў Мінску — і будаўніцтва. Даводзіцца канстатаваць, што не хочуць маладыя людзі прысвячаць сваё жыццё цяжкім прафесіям...

— За апошнія гады адраснасць падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў істотна павысілася. 94,7 працэнта маладых рабочых рыхтуюцца сёння па дагаворах з заказчыкамі, — паведаміў на калегіі, прысвечанай рэалізацыі дзяржаўных праграм развіцця прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі на 2006—2010 гады, **намеснік міністра адукацыі Барыс ІВАНОЎ**. — Сістэма адукацыі аператыўна рэагуе на патрэбы рынку працы. Так, за апошнія гады ў Беларусі была распачата падрыхтоўка рабочых па 14 новых прафесіях (апаратчык палімерызацыі, абіўшчык мэблі, аператар шліхтавальнага абсталявання, зборшчык-клёпачнік лятальных апаратаў, рэстаўратар вырабаў з драўніны, саставіцель цягнікоў, садоўнік і г.д.) і спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй па 6 новых спецыяльнасцях: «турызм і гасціннасць», «лінгвістычнае забеспячэнне сацыякультурнай дзейнасці», «садова-паркавае будаўніцтва», «тэхнічнае абслугоўванне кінаабсталявання і аўдыёвізуальных сістэм», «абсталяванне і тэхналогія электравакуумнай вытворчасці», «цеплагазазабеспячэнне, вентыляцыя і ахова паветранага басейна». На падставе прапаноў наймальнікаў былі ўнесены змяненні ў Агульнадзяржаўны класіфікатар спецыяльнасцяў і кваліфікацый: уведзены 8 новых спецыяльнасцяў і 36 новых рабочых кваліфікацый.

Сёння працягваецца праца па аптымізацыі сеткі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі. 51 установа перайменавана ў прафесійныя ліцэі, 12 — у прафесійна-тэхнічныя каледжы і 9 — рэарганізаваныя шляхам зліцця ці далучэння. Такім чынам, у сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі цяпер працуюць 54 прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, 104 прафесійныя ліцэі і 64 ПТК.

**Міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ** прызнаўся, што ён асабіста не бачыць прынцыповай розніцы паміж ПТВ і прафесійнымі ліцэямі. Задачы, якія ставяцца перад гэтымі ўстановамі — аднолькавыя. Выходзіць, што змяняецца толькі назва? А як патлумачыць дэпутатам, якія сёння працуюць над праектам Кодэкса аб адукацыі, што ў нас ліцэі дзейнічаюць і ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі, і ў сістэме прафтэхадукацыі? Магчыма, трэба сістэму прафтэхадукацыі ўніфікаваць?

> **Вынікі сацыялагічнага даследавання паказалі, што прафесійнай самарэалізацыі маладых людзей перашкаджае нізкі ўзровень заработнай платы, несправядлівая сістэма ўзнагароджання за працу, калі адсутнічае фінансавае заахвочванне дадатковых намаганняў, састарэлае абсталяванне на прадпрыемствах, адсутнасць новаўвядзенняў і магчымасці для іх укаранення.**

Барыс Іваноў упэўнены, што такая разнастайнасць формаў атрымання адукацыі — ПТВ, ПТК, прафесійныя ліцэі — дазволіла прыцягнуць у сістэму прафтэхадукацыі большую колькасць маладых людзей. Ён паведаміў, што прафесійна-тэхнічныя вучылішчы хутка ўвогуле знікнуць, а іх месца зоймуць ліцэі. Праўда, не зусім зразумела, што зменіцца пасля змены шыльды. Няўжо слова «ліцэй» гучыць больш высакародна, чым «вучылішча»?

Падчас правядзення ў маі ў Мінску міжнароднай канферэнцыі па прафесійна-тэхнічнай адукацыі міністр адукацыі Расійскай Федэрацыі Андрэй Фурсенка прызнаўся, што ён супраць таго, каб разглядаць прафтэхшколу ў якасці «камеры захоўвання для няўдачнікаў». У першую чаргу — гэта інстытуты развіцця, дзе маладым людзям даюць штуршок у новае дарослае жыццё, даюць прафесійны падмурак. Хоць не сакрэт, што многія разглядаюць навучанне ў прафтэхустанове ў якасці запаснога аэрадрома (на той выпадак, калі не пашанцуе пры паступленні на больш высокую ступень навучання). Аляксандр Радзькоў невыпадкова пацікавіўся ў Барыса Іванова, хто больш працяглы час затрымліваецца ў прафесіі: маладыя людзі, якія атрымлівалі прафтэхадукацыю на аснове базавай адукацыі, ці тыя, хто паступаў пасля заканчэння сярэдняй школы? Адказ быў адназначны: на рабочую прафесію больш нацэленыя маладыя людзі, якія паступалі пасля 9 класаў. За тры гады навучання яны паспяваюць «захварэць» сваёй прафесіяй. А для ўчарашніх адзінаццацікласнікаў даволі часта прафесійна-тэхнічная ўстанова становіцца толькі транзітным калідорам. Хоць шанцы застацца беспрацоўнымі ў прадстаўнікоў рабочых прафесій — мінімальныя. Больш як 75 працэнтаў выпускнікоў атрымліваюць паралельна дзве і больш прафесій, што дадаткова страхуе іх на рынку працы.

Між іншым, выдаткі на падрыхтоўку аднаго рабочага з кожным годам павялічваюцца: толькі за чатыры апошнія гады яны ўзраслі амаль удвая. Цяпер нарматыў бюджэтных выдаткаў складае ў сярэднім 5,3 мільёна рублёў. Таму цяжка не пагадзіцца з думкай, што працэс павелічэння аб'ёмаў падрыхтоўкі і выпуску з навучальных устаноў рабочых кадраў не можа быць бясконцым. Неабходна, каб за напаўненне рынку працы несла адказнасць не толькі сістэма адукацыі, але і заказчыкі кадраў, замацоўваючы ў сябе маладых спецыялістаў. Тут ёсць над чым задумацца. Вынікі сацыялагічнага даследавання, праведзенага інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сёлетнім верасні сярод рабочых ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў (621 чалавек) і навучэнцаў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў (621 чалавек) паказалі, што адна з галоўных праблем, якая перашкаджае прафесійнай самарэалізацыі маладых людзей, — гэта нізкі ўзровень заработнай платы (на гэту прычыну ўказала большая палова маладых рабочых). Трэць рэспандэнтаў згадалі несправядлівую, па іх меркаванні, сістэму ўзнагароджання за працу, калі адсутнічае фінансавае заахвочванне дадатковых намаганняў, а больш як чвэрць — састарэлае абсталяванне на прадпрыемстве, адсутнасць новаўвядзенняў і магчымасці для іх укаранення.

Міністэрствам адукацыі быў праведзены таксама маніторынг якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Анкетаваннем ахапілі 473 арганізацыі-заказчыкі кадраў з 22 галін эканомікі. Усе ўдзельнікі апытання паведамілі, што якасць тэарэтычнай падрыхтоўкі маладых спецыялістаў іх задавальняе. Асобныя кіраўнікі прадпрыемстваў указалі на недастатковую якасць практычнай падрыхтоўкі выпускнікоў. Аднак на пытанне, ці мае арганізацыя неабходныя ўмовы для праходжання навучэнцамі практыкі (вучэбныя майстэрні, абсталяваныя класы, падрыхтаваных майстроў) адмоўны адказ далі 86 працэнтаў арганізацый сацыяльнага забеспячэння, 58 працэнтаў будаўнічых арганізацый і 52 працэнты арганізацый гандлю і грамадскага харчавання.

У 2006—2009 гадах на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальных устаноў прафтэхадукацыі было накіравана 69,9 млрд рублёў: 59,2 млрд бюджэтных сродкаў, 7,1 млрд пазабюджэтных сродкаў устаноў адукацыі і 3,6 млрд сродкаў арганізацый. За гэты час набыты 162 сучасныя камп'ютарныя класы, 5587 адзінак машын і абсталявання, што дазволіла істотна абнавіць матэрыяльна-тэхнічную базу навучальных устаноў прафтэхадукацыі.

Апошнім часам стаўка робіцца на стварэнне на базе прафтэхустаноў так званых рэсурсных цэнтраў з канцэнтрацыяй там новай дарагой і навукаёмістай тэхнікі і абсталявання, дзе можна арганізаваць павышэнне кваліфікацыі педагагічных работнікаў, апрабаваць новыя адукацыйныя тэхналогіі, ажыццяўляць павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў прадпрыемстваў. Напрыклад, сёлета ў прафесійна-тэхнічным каледжы Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі распачалася падрыхтоўка па зусім новай для Беларусі спецыяльнасці «мехатроніка». Для таго, каб яе адкрыць, давялося стварыць у навучальнай установе палігон сучаснай тэхнікі. Больш як 15 прадпрыемстваў і арганізацый агульнымі намаганнямі стварылі ў каледжы сапраўдны тэхнапарк. А майстры вытворчага навучання і педагогі былі накіраваны на стажыроўкі ў Германію і Англію. Рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аркадзь Шкляр лічыць, што сістэма прафтэхадукацыі павінна сёння не проста паспяваць за вытворчасцю, а ў чымсьці яе апярэджваць. У РІПА ўжо ёсць напрацоўкі па праблемах кіравання якасцю ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў адпаведнасці са стандартам серыі ISO9000. Трэба заўважыць, што сертыфікацыя якасці навучальнага працэсу — новы крок не толькі для прафтэхшколы, але і для вышэйшай школы. Аднак любая вышыня можа скарыцца...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Ёсць нагода!

### 10 снежня — Сусветны дзень футбола

Адзначаецца ён па рашэнні ААН. Такім чынам міжнародная супольнасць аддае даніну павагі гэтаму віду спорту, які для многіх стаў стылем і ладам жыцця.

У тым ці іншым варыянце гульня ў футбол была вядома яшчэ тры тысячы гадоў таму. У футбол гулялі ў Старажытнай Грэцыі і Рыме. У Грэцыі гэтая гульня называлася «бітвай за мяч». Можна меркаваць, што падчас матча гульцы прымянялі і прыёмы баявых майстэрстваў.

Першае ўзгадванне футбола як «гульні ў мяч нагамі» гісторыкі знайшлі ў кітайскіх крыніцах, датаваных другім тысячагоддзем да нашай эры. Яна мела назву Цу Чу, што значыць «піхаць нагой» і дапамагала кітайскім воінам падтрымліваць добрую фізічную форму.



Некаторыя лічаць, што папярэднікам футбола была і гульня саксонцаў, якія насялялі Англію ў VIII стагоддзі.

## БЕЛАРУСКІ ХАКЕЙ ШУКАЕ ВАЛАНЦЁРАЎ

**Беларуская федэрацыя хакея аб'віла аб наборы валанцёраў. Іх дапамога спатрэбіцца падчас правядзення ў сталіцы і іншых гарадах Беларусі буйных міжнародных спаборніцтваў. Гэта чэмпіянат свету па хакеі з шайбай сярод юніёраў, які пройдзе ў сталіцы і ў Бабруйску з 13 па 23 красавіка 2010 года, IV Калядны турнір і «Турнір шасці нацый».**

Як паведамляе прэс-служба федэрацыі хакея, валанцёры будуць сустракаць і суправаджаць каманды, забяспечваць працу прэс-цэнтра, весці пратаколы пасяджэнняў аргкамітэту, размяшчаць інфармацыю ў Інтэрнэце. Патрабаванні да іх мінімальныя — узрост ад 18 гадоў. Пажадана таксама веданне замежнай мовы.

Валанцёры не толькі будуць вызваленыя ад вучобы на перыяд турніраў, але і атрымаюць магчымасць папрактыкавацца ў мове, пазнаёміцца з замежнымі гасцямі і паказаць ім сваю краіну, паўдзельнічаць ва ўнікальнай падзеі, даведацца пра хакейную кухню знутры і адчуць сябе часткай вялікай каманды. А ў будучым, магчыма, і атрымаць працу ў федэрацыі хакея — большасць яе цяперашніх супрацоўнікаў пачыналі менавіта валанцёрамі.

Усе жадаючыя могуць запоўніць анкету (яе можна знайсці на сайце федэрацыі www.hockey.by) і адправіць на электронны адрас leshchenko@hockey.by (з паметкай «Валанцёр»).

**Алена КРАВЕЦ.**

## «НЯЛЮДСКІ ТРАФІК»

**Своеасаблівым напамінкам аб трагічных лёсах дзяўчат, якія трапілі ў сеткі гандляроў «жывым таварам», стала інфармацыйна-асветніцкая акцыя для моладзі «Спынім гандаль людзьмі!». Яна прайшла ў Мінску і была прымеркавана да Міжнароднага дня барацьбы за адмену рабства.**

Акцыя адбылася ў рамках праекта Еўрапейскага саюза, Праграмы развіцця ААН і Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) аб папярэджанні, барацьбе і мінімізацыі сацыяльных наступстваў у гандлі людзьмі ў Беларусі сумесна з адміністрацыяй Маскоўскага раёна Мінска. Агульная мэта мерапрыемства — павысіць інфармаванасць маладых людзей па пытаннях прафілактыкі гандлю людзьмі, пазнаёміць іх з асноўнымі правіламі бяспечнага выезду за мяжу. У акцыі ўдзельнічалі сотні навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў сталіцы. Ім таксама падрабязна расказалі аб асноўных правілах знаходжання за мяжой, аб тым, з кім трэба кансультавацца ў час няштатных сітуацый.

Кульмінацыяй акцыі стаў паказ дакументальнага фільма «Нялюдскі трафік», створанага тэлеканалам MTV у рамках сацыяльнай кампаніі «MTV Exit» пры ўдзеле вядомай галівудскай актрысы Анджэліны Джолі. У дынамічнай і пераканаўчай форме фільм распавядае аб трагічных гісторыях дзяўчат, якія трапілі ў сэксуальнае рабства ў розных краінах Еўропы. Напрыклад, Ганны, якую яе сусед нелегальна перавёз у адну з балканскіх краін, дзе яе прымушалі займацца прастытуцыяй. Ці Таццяны, якая апынулася ў сэксуальным рабстве ў Амстэрдаме, пасля таго як яе прадаў найбліжэйшы сябар. Арганізатары акцыі заклікалі кожнага, каму вядомыя факты гандлю «жывым таварам», не заставацца раўнадушным і зрабіць усё магчымае, каб спыніць злачынцаў.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## Ведай нашых!

### Праграмісты БДУ прабіліся ў сотню лепшых

**КАМАНДА БДУ, адзіная з Беларусі, здолела прабіцца ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў. Паўфінальныя спаборніцтвы адбыліся ў Санкт-Пецярбургу. Удзел у іх узялі 199 камандаў ВНУ, якія прадстаўлялі Беларусь, Расію, Украіну, Латвію, Літву, Казахстан, Грузію, Арменію, Кіргізію і Узбекістан.**

Каманды БДУ выступілі проста бліскуча: фактычна з чатырох камандаў, што адстойвалі гонар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, па сваіх выніках права выступаць у фінале заваявалі тры каманды. Аднак па правілах правядзення спаборніцтваў прадстаўляць ВНУ ў фінале можа толькі адна каманда.

У выніку запаветную пуцёўку ў фінал атрымала каманда, за якую выступалі Канстанцін Багданаў (студэнт 2-га курса ФПМІ), Аляксей Лобанаў (5-ы курс ФПМІ) і Аляксей Тоўсцікаў (аспірант ФПМІ). Яны рашылі за пяць гадзін 8 з 11 прапанаваных арганізатарамі задач. Між іншым, абсалютныя пераможцы спаборніцтваў — каманда Петразаводскага дзяржаўнага ўніверсітэта — рашылі ўсяго на адну задачу больш.

Дзве каманды БДУІР занялі 48-е і 67-е месца ў рэйтынгу паўфінальных спаборніцтваў, а ў каманды праграмістаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта — 66-е месца.

Фінал чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнтаў адбудзецца ў лютым 2010 года ў Харбіне (Кітай). Там сустрэнуцца лепшыя студэнцкія каманды са 100 універсітэтаў свету.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Студэнцкая занятасць

# ПРАЦА=РАМАНТЫКА!

**ЗАВЯРШЫЎСЯ трэці працоўны семестр. Яго афіцыйнае закрыццё пройдзе сёння ў сталіцы ў рамках Рэспубліканскага злёту студэнцкіх атрадаў «Маладосць — Праца — Рамантыка». Больш за 300 байцоў студатрадаў і валанцёраў з усіх рэгіёнаў краіны прыедуць у сталіцу. Сёння лепшых удзельнікаў студэнцкіх і валанцёрскіх атрадаў будуць ушаноўваць у Мінскай гарадской ратушы і Рэспубліканскім доме моладзі. Вынікі трэцяга працоўнага семестра «Лета-2009» мы папрасілі падвесці камісара Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў Нэлі БОБРЫК.**



— З кожным годам студатрадаўскі рух набывае ўсё большую папулярнасць у беларускіх юнакоў і дзяўчат. Сёлета ён аб'яднаў 72 тысячы маладых людзей (гэта разам з індывідуальна працаўладкаванымі маладымі людзьмі). Летась гэта лічба дасягала 65 тысяч. У 1678 студэнцкіх і валанцёрскіх атрадах сёлета працавала больш за 61 тысячу студэнтаў і школьнікаў. Напрамкі дзейнасці атрадаў самыя розныя: будаўнічы, сельскагаспадарчы, педагагічны, сэрвісны, экалагічны і валанцёрскі. Апошнія працуюць у рамках нашага маладога валанцёрскага руху «Добрае сэрца».

Нашы студэнцкія атрады на працягу апошніх гадоў працавалі на сацыяльна-значных аб'ектах Беларусі, такіх, як гандлёвы комплекс «Аэрадромны» ў аэрапорце «Мінск-1», гандлёвы цэнтр «Падземны горад», стадыён «Нёман» і абласная клінічная бальніца ў Гродне, спарткомплекс «Брэсцкі», гасцініца «Еўропа», Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета, спартыўны комплекс «Мінск-Арэна», Верхні горад у Мінску, Лядовы палац у Баранавічах і Салігорску, сталічны Батанічны сад, замак Радзівілаў у Нясвіжы і іншыя. Акрамя таго, па традыцыі юнакі і дзяўчаты працуюць на будаўніцтве і добраўпарадкаванні аграгарадкоў, у гарадах краіны па падрыхтоўцы да фестывалю «Дажынкі».

Штабы студэнцкіх атрадаў прыцягваюць моладзь у якасці валанцёраў для ўдзелу у суботніках і працоўных акцыях, падчас якіх ажыццяўляецца збор сродкаў на рэканструкцыю памятных гістарычных месцаў, якія маюць вялікае значэнне для беларускага народа. Юнакі і дзяўчаты таксама працуюць за межамі краіны. У прыватнасці, у Расіі і ва Украіне. Асноўныя віды работ за мяжой — будаўніцтва дарог, сельскагаспадарчыя работы, сэрвіснае абслугоўванне, педагагічная работа. Сёлета каля 600 маладых людзей працавалі за межамі краіны. Мы пасля доўгага перапынку ў 2007 годзе аднавілі практыку адпраўкі атрадаў у далёкія рэгіёны Расіі (Ямала-Нянецкую Аўтаномную акругу, Амурскую вобласць). Думаем, што гэта практыка будзе працягвацца.

***— І як, паводле вашых заўваг, ацэньваюць работу нашых юнакоў і дзяўчат замежныя наймальнікі?***

— Вельмі добра ацэньваюць. Нашы юнакі і дзяўчаты працуюць насамрэч добра і адказна. Таму іх хваляць. Прычым маладым людзям падабаецца працаваць і дабівацца высокіх вынікаў. Тым больш, што за гэта яны атрымліваюць фінансавую падтрымку ў выглядзе заробку. Таму яны стараюцца. Любы працадаўца зацікаўлены ў такіх людзях. Да таго ж, добра арганізаваны і ўмовы жыцця студатрадаўцаў: пражыванне, харчаванне, культурная праграма. Праводзяцца спартыўныя мерапрыемствы, спаборніцтвы як унутры атрадаў, так і паміж беларусамі і расіянамі.

***— Па якіх крытэрыях адбіраюць маладых людзей у студатрады?***

— У студатрад могуць запісацца абсалютна ўсе. Можна прыйсці ў любы штаб: рэспубліканскі, абласны, мінскі гарадскі і напісаць заяву. Толькі ў маладога чалавека павінна быць медыцынская даведка, што ў яго няма супрацьпаказанняў на тую ці іншую працу. Асабліва калі гаворка ідзе пра будаўнічы атрад. Да таго ж, у яго не павінна быць акадэмічнай запазычанасці па вучобе. Таксама можа прыйсці і школьнік з 14 гадоў.

***— Якім чынам падбіраецца профіль атрада?***

— Безумоўна, больш за ўсё заработная плата ў будаўнічых атрадах. Але ўсіх туды не возьмеш. У асноўным гэта юнакі, хоць дзяўчаты таксама ёсць у атрадах. У нас нават сёлета ёсць дзяўчаты, якія перамаглі з'яўляючыся камандзірамі будаўнічых атрадаў. У дзяўчат ёсць магчымасць падзарабіць у якасці падсобных рабочых. У асноўным у будаўнічыя атрады трапляюць тыя, хто ўжо мае будаўнічую спецыяльнасць альбо перад тым, як іх уключыць у атрад, яны праходзяць падрыхтоўку на базе навучальнай установы, дзе ім даюць элементарныя навыкі па такіх спецыяльнасцях, як муляр, бетоншчык. У педагагічныя атрады таксама набіраем дзяўчат з адпаведнай спецыялізацыяй. Але ёсць такая праца, як мыйшчык посуду, афіцыянтка, сюды набіраем усіх ахвотных.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

## Школа юнкараў

# АЎТАХЛАМ У ДВАРЫ

**КАЛІ вы чуеце словазлучэнне «гарадская нерухомасць», якія вобразы ўзнікаюць у вашым уяўленні? Хутчэй за ўсё, кватэры ў прыгожых дамах, якія так імкнуцца займець большасць грамадзян. Аднак, ёсць і іншая «нерухомасць», якая абсалютна нікому не патрэбна і нават замінае. Гаворка ідзе пра кінутыя аўтамабілі.**

Транспартныя сродкі, якія пацярпелі ў аварыях, і, як правіла, не падлягаюць рамонту, ці тыя, што проста ад'ездзілі сваё, стаяць у двары дамоў у сумнай адзіноце. Яны ствараюць масу нязручнасцяў для жыхароў і камунальных службаў: займаюць паркавальныя месцы, наносяць шкоду экалогіі і проста парушаюць прыгажосць гарадскіх вулак. Трэба адзначыць, што гэтыя ржавыя груды металалому могуць нават пагражаць жыццю. Напрыклад, ёсць выпадкі, калі дзеці, гуляючы, спрабавалі падпаліць рэшткі бензіну ў баку. Уявіце, што магло б адбыцца, калі б у іх гэта атрымалася.

Гэтыя аўтамабілі можна сустрэць практычна ў кожным двары. Кожная адзінка такога аўтахламу займае ў сярэднім 2,5 метра плошчы. У Мінску сёння прыкладна 1300 вуліц. Калі ўзяць лічбу 5 за сярэднюю колькасць двароў на адной вуліцы, то атрымліваецца каля двух дзясяткаў кіламетраў занятай гарадской плошчы. Якая ж тады лічба атрымаецца ў маштабах рэспублікі...

Працэс зачысткі сталічных двароў ад кінутага транспарту часта тармозіцца той акалічнасцю, што любая машына, нават самая ржавая — гэта ўласнасць, і забраць яе без згоды гаспадара ніяк нельга. На пошук гэтых самых гаспадароў у супрацоўнікаў ДАІ нярэдка трацiцца некалькі месяцаў, а каб угаварыць уладальніка здаць транспарт ва ўтылізацыю — яшчэ больш (прытым пакуль бясплатна). На гэта ёсць шмат прычын, напрыклад, гаспадар можа не жыць у Мінску, ці прадаць аўтатранспарт па даверанасці.

Сёння аўтамабілі, лёс якіх пакуль пад пытаннем, эвакуююць на адмысловыя пляцоўкі. Пра гэта паведамляюць у дзяжурную часць ДАІ на выпадак, калі гаспадар раптам успомніць, што ў яго ёсць машына і пачне шукаць свой транспарт. Там аўтамабілі знаходзяцца ў чаканні сваёй долі: або ўсё-такі адшукаецца ўладальнік, які захоча вярнуць уласнасць (такое здараецца вельмі рэдка), або машыну адправяць на металалом. Але такі алгарытм малаэфектыўны і адпаведныя органы працуюць над яго ўдасканаленнем. У любым выпадку, поўнае вырашэнне праблемы магчымае толькі тады, калі людзі самі зразумеюць: вуліцы і двары — не месца для захоўвання аўтамабільнага хламу.

**Сяргей РОЗУМ,**

*г. Мінск.*

# АЛІМПІЯДНІКІ — ГЭТА СУБКУЛЬТУРА

**АЛЯКСЕЙ Лабанаў, Дзмітрый Багданаў і Аляксей Тоўсцікаў паасобку звычайныя студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, а разам — адзіная з Беларусі каманда, якая выйшла ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні. Так трымаць! Оле-оле-оле! Не здзіўляйцеся такой спартыўнай цікавасці да іх дзейнасці. Таму што чэмпіянат па праграмаванні — гэта як асобны від спорту. Тут і запал, і дух спаборніцтваў, і горыч расчаравання, і асалода перамогі. Карацей кажучы, Дзіма Багданаў, студэнт першага курса ФПМІ, і Аляксей Тоўсцікаў, аспірант БДУ, падзяліліся з карэспандэнтам «ЧЗ» сваімі разважаннямі наконт папулярызацыі праграмавання сярод масавай аўдыторыі і ацанілі свае шанцы ў фінале, які адбудзецца ў лютым 2010 года ў Кітаі.**

***— Вы настроеныя на перамогу?***

**Дзіма:** Мы настроеныя пазмагацца за медаль. Канкурэнцыя ў фінале будзе вялікай. Гэта Оксфард, Кембрыдж, МДУ. Найвышэйшая мэта — проста паўдзельнічаць, а потым ужо мары.

**Аляксей:** Пра фінал гаварыць яшчэ рана. Дарэчы, у паўфінале ўдзельнічалі тры каманды БДУ, кожная з якіх магла б прадстаўляць нашу ВНУ ў фінале. Неблагі ўзровень падрыхтоўкі быў відавочны ўжо на трэніроўках. Аднак мы рашылі на дзве задачы больш і сталі фіналістамі, што, безумоўна, не можа нас не радаваць.

***— Вы рашылі восем задач з прапанаваных 11. Абсалютныя пераможцы паўфіналу, каманда Петразаводскага дзяржаўнага ўніверсітэта, рашыла на адну задачу больш. Вы наступалі лідарам на пяткі.***

**Аляксей:** За пяць гадзін, менавіта столькі працягваўся паўфінал, мы адолелі толькі 8 заданняў. А апошнюю задачу здалі ўсяго толькі за 1 хвілінку 40 секундаў да заканчэння спаборніцтваў. Увогуле, апошнія дзесяць хвілін у нас ішла напружаная дзейнасць галаўнога мозга.

**Дзіма:** Аднак, дзякуючы такому выпадку, знайшлася назва для нашай каманды. Гэта «Last success» (*з англ. — апошняя ўдача*). Шчыра кажучы, не хапіла на ўсё часу. Таму што менавіта ў апошнія хвіліны твой мозг пачынае перапрацоўваць усю інфармацыю, атрыманую за чатыры гадзіны няспыннай працы.



***— Думаю, што пяць гадзін інфарматыкі, змешанай з матэматыкай, вытрымаў бы не кожны кваліфікаваны праграміст.***

**Дзіма:** Многім здаецца, што пяць гадзін для алімпіяды — гэта вялізны адрэзак часу. Аднак усё праходзіць як адна хвіліна. Няма часу абстрагавацца нават на імгненне.

**Аляксей:** Для нас чэмпіянат як матч для футбаліста. Ні адзін з футбалістаў не скажа, што 90 хвілін для яго вялікі перыяд часу. Рашэнне задач — гэта спорт, гэта драйв. Мінулай вясной у Стакгольме праходзіў фінал алімпіяды па праграмаванні. Яго транслявалі па адным з мясцовых тэлеканалаў і па інтэрнэце. Сто лепшых камандаў з усяго свету ў адной зале рашаюць задачы на хуткасць, амаль кожную хвіліну можа змяніцца табло, а калі яшчэ і каментарыі прафесійныя — гэта не проста цікава, гэта захапляльна. Калі чалавек не ведае правілаў кёрлінгу, то і глядзець, як спартсмены катаюць па лёдзе цяжкі шар, ніхто не захоча. Так і тут. Можна папулярызаваць спартыўнае праграмаванне пры дапамозе тэлебачання ці радыё, даваць агляды спаборніцтваў, тады многія зразумелі б, што насамрэч гэта спорт.

***— Як бачу, узрост у праграмаванні не галоўнае: Аляксей Тоўсцікаў — аспірант, Лёша Лабанаў — пяцікурснік, а Дзіма толькі паступіў ва ўніверсітэт.***

**Аляксей:** Насамрэч, мы заўсёды цікавімся, хто паступае да нас на факультэт, сочым за тым, як выступаюць на міжнародных алімпіядах беларускія школьнікі. І наша сустрэча з Дзімам не была выпадковай (*смяецца*).

**Дзіма:** Алімпіяднікі — гэта субкультура. Ёсць панкі і металісты, а мы — алімпіяднікі.

***— Апроч алімпіяд па праграмаванні, вас нешта яшчэ захапляе?***

**Аляксей:** Алімпіяда — гэта для мяне і ёсць адпачынак. Тым больш, калі выпадае вольная хвілінка, праводжу яе са сваім маленькім сынам. Аднак 24 гадзіны ў суткі хапае не на ўсё, што хочацца зрабіць. У нас на тыдзень 2 камандныя трэніроўкі па 5 гадзін. Пры гэтым адно асабістае спаборніцтва, дзе кожны сам за сябе. Яшчэ патрэбен час для самаўдасканалення па прадмеце.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

## Закон Рэспублікі Беларусь

### Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дэкларавання фізічнымі асобамі даходаў, маёмасці і крыніц грашовых сродкаў

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 12 лістапада 2009 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 19 лістапада 2009 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 года «Аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў, маёмасці і крыніц грашовых сродкаў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/923; 2006 г., № 78, 2/1208, 2/1212; № 112, 2/1244) змяненні і дапаўненні, выклаўшы яго ў новай рэдакцыі:

# «Закон Рэспублікі Беларусь

## Аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці

Гэты Закон вызначае прававыя і арганізацыйныя асновы дэкларавання фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці і накіраваны на забеспячэнне абароны эканамічных інтарэсаў дзяржавы, рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы барацьбы з карупцыяй, папярэджанне, выяўленне і спыненне карупцыйных правапарушэнняў.

**Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, што прымяняюцца ў гэтым Законе, і іх азначэнні**

Для мэтаў гэтага Закона прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

блізкія сваякі — бацькі, дзеці, усынавіцелі (удачарыцелі), усыноўленыя (удачароныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі;

дзяржаўная арганізацыя — унітарнае прадпрыемства, установа, дзяржаўнае аб'яднанне, маёмасць якіх знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці (уласнасці Рэспублікі Беларусь або яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі) і замацаваная за імі на праве гаспадарчага распараджэння або аператыўнага кіравання;

даходы — любыя грашовыя сродкі, у тым ліку пазыкі, а таксама іншая маёмасць, атрыманыя фізічнымі асобамі ад грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян, асобаў без грамадзянства і арганізацый;

асобы, якія сумесна пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, — асобы, якія пражываюць у адным жылым памяшканні і вядуць агульную гаспадарку, цалкам або часткова аб'ядноўваючы і расходуючы свае грашовыя сродкі і іншую маёмасць;

аб'ект, які не завершаны будаўніцтвам, — капітальнае збудаванне (будынак) і іншая маёмасць, будаўніцтва якіх дазволена ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, але не завершана (будаўніцтва якіх працягваецца, прыпыненае, спыненае або закансерваванае) або будаўніцтва якіх завершана, але гэтыя аб'екты не зарэгістраваныя ў парадку, вызначаным актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

выдаткі — любыя грашовыя сродкі і іншая маёмасць фізічных асобаў, накіраваныя імі на набыццё маёмасці, выкарыстаныя на іншыя мэты;

фізічныя асобы — грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія атрымалі ў парадку, вызначаным актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, дазвол на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь.

**Артыкул 2. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб дэклараванні даходаў і маёмасці**

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб дэклараванні даходаў і маёмасці грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з гэтага Закона, нарматыўных прававых актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь вызначаны іншыя правілы, чым тыя, якія прадугледжаны гэтым Законам, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

**Артыкул 3. Сфера дзеяння гэтага Закона**

Гэты Закон рэгулюе адносіны, якія ўзнікаюць пры дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці, а таксама пры ажыццяўленні кантролю ў сферы дэкларавання даходаў і маёмасці.

Дзеянне гэтага Закона не распаўсюджваецца на адносіны, якія ўзнікаюць пры:

дэклараванні даходаў і маёмасці асобаў, якія вылучаны кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, іх блізкіх сваякоў, мужа (жонкі) і яго (яе) бацькоў;

дэклараванні даходаў і маёмасці асобаў, якія вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты абласных, Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў;

дэклараванні даходаў пры рэгістрацыі ў органах дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва ў якасці беспрацоўных;

падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падаходным падатку з фізічных асобаў.

**Артыкул 4. Асобы, абавязаныя ажыццяўляць дэклараванне**

Фізічныя асобы абавязаны ажыццяўляць дэклараванне ў выпадках, прадугледжаных гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Ад абавязку падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці вызваляюцца грамадзяне, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь:

кіраўнікі, а таксама дыпламатычны персанал дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў;

кіраўнікі, а таксама консульскія службовыя асобы консульскіх устаноў замежных дзяржаў;

кіраўнікі, а таксама службовыя асобы прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь;

адміністрацыйна-тэхнічны персанал дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў, консульскіх устаноў замежных дзяржаў, прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь;

абслуговы персанал дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў, консульскіх устаноў замежных дзяржаў, прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь;

іншыя асобы, даходы і маёмасць якіх не падлягаюць дэклараванню ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 5. Даходы, якія падлягаюць абавязковаму дэклараванню**

Абавязковаму дэклараванню ў выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Законам, падлягаюць даходы фізічных асобаў, атрыманыя на працягу каляндарнага года ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь, а таксама ад крыніц за межамі Рэспублікі Беларусь.

У выпадку, прадугледжаным часткай чацвёртай артыкула 12 гэтага Закона, дэклараванню падлягаюць даходы, атрыманыя фізічнымі асобамі за іншы перыяд.

У дэкларацыі аб даходах і маёмасці пазначаюцца таксама пазыкі, атрыманыя за перыяд, які папярэднічае перыяду, за які падаецца дэкларацыя аб даходах і маёмасці, і не вернутыя на дату падачы дэкларацыі. Такія даходы пазначаюцца ў памеры атрыманых пазык.

Калі ў дзяржаўны орган (арганізацыю), у тым ліку падатковы орган, службовай асобе дэкларацыя аб даходах і маёмасці падавалася раней, то пры падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці ў гэты ж дзяржаўны орган (арганізацыю), у тым ліку падатковы орган, гэтай жа службовай асобе раней адлюстраваныя ў дэкларацыі звесткі аб даходах могуць не пазначацца.

Даходы, названыя ў частцы першай гэтага артыкула, падлягаюць абавязковаму дэклараванню незалежна ад таго, ці з'яўляюцца яны аб'ектам падаткаабкладання або вызвалены ад падаткаабкладання ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь могуць быць вызначаны выпадкі, калі даходы фізічных асобаў абавязковаму дэклараванню не падлягаюць.

**Артыкул 6. Маёмасць, якая падлягае абавязковаму дэклараванню, і вызначэнне яе кошту**

Абавязковаму дэклараванню ў парадку, вызначаным гэтым Законам, падлягае маёмасць, якая знаходзіцца ва ўласнасці фізічных асобаў на дату падачы дэкларацыі:

зямельныя ўчасткі, капітальныя збудаванні (будынкі), ізаляваныя памяшканні, у тым ліку жылыя дамы, жылыя памяшканні (кватэры, пакоі), дачы, садовыя дамкі, гаражы;

транспартныя сродкі (за выключэннем мапедаў і прыраўнаваных да іх механічных транспартных сродкаў, веласіпедаў, гужавога транспарту), самаходныя машыны, марскія судны, судны ўнутранага плавання і змешанага (рака — мора) плавання (за выключэннем маламерных суднаў, гідрацыклаў і суднаў з падвяснымі рухавікамі), паветраныя судны;

творы мастацтва, каштоўныя металы і каштоўныя камяні, вырабы з іх, кошт кожнага з якіх перавышае адну тысячу базавых велічыняў ці агульны кошт якіх перавышае дзве тысячы базавых велічыняў;

будаўнічыя матэрыялы, агульны кошт якіх перавышае дзве тысячы базавых велічыняў;

долі ў статутных фондах (акцыі) гаспадарчых таварыстваў, паі ў маёмасці вытворчых і спажывецкіх кааператываў, аб'екты, не завершаныя будаўніцтвам, іх часткі, прадпрыемствы як маёмасныя комплексы на суму, якая перавышае пятнаццаць тысяч базавых велічыняў;

іншая маёмасць, кошт адзінкі якой перавышае дзве тысячы базавых велічыняў;

долі ў праве ўласнасці на маёмасць, названую ў абзацах другім і трэцім гэтай часткі;

долі ў праве ўласнасці на маёмасць, названую ў абзацах чацвёртым — сёмым гэтай часткі, калі іх кошт перавышае межы, вызначаныя адпаведнымі абзацамі гэтай часткі.

Маёмасць, названая ў абзацах другім, трэцім і восьмым часткі першай гэтага артыкула, падлягае дэклараванню незалежна ад яе кошту.

Маёмасць, названая ў абзацах чацвёртым — сёмым і дзявятым часткі першай гэтага артыкула, падлягае дэклараванню ў выпадку, калі яе кошт на дату падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці перавышае межы, вызначаныя адпаведнымі абзацамі часткі першай гэтага артыкула.

Кошт маёмасці, названай у абзацах чацвёртым — сёмым і дзявятым часткі першай гэтага артыкула, для ўстанаўлення неабходнасці яе дэкларавання вызначаецца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Кошт дэкларуемай маёмасці пазначаецца фізічнай асобай у дэкларацыі аб даходах і маёмасці па цане яе набыцця. Калі маёмасць атрыманая фізічнай асобай бязвыплатна, у спадчыну або па здзелках, якія не прадугледжваюць правядзенне разлікаў, кошт такой маёмасці ў дэкларацыі не пазначаецца.

Пры вызначэнні кошту дэкларуемай маёмасці палажэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ацэначнай дзейнасці не прымяняюцца, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Не падлягаюць дэклараванню грашовыя сродкі, якія знаходзяцца ва ўласнасці фізічных асобаў, у тым ліку размешчаныя фізічнымі асобамі на рахункі і (або) ва ўклады (дэпазіты) у банках Рэспублікі Беларусь (у тым ліку працэнты па іх), іх выдача, а таксама перавод з рахункаў (укладаў) у банках іншых дзяржаў у банкі Рэспублікі Беларусь, аблігацыі, вэксалі і іншыя каштоўныя паперы, якія знаходзяцца ва ўласнасці фізічных асобаў, за выключэннем каштоўных папер, названых у абзацы шостым часткі першай гэтага артыкула.

Калі склад раней дэклараванай маёмасці не змяніўся, пра гэта паведамляецца ва ўсіх наступных дэкларацыях аб даходах і маёмасці, што падаюцца па патрабаванні аднаго і таго ж падатковага органа альбо ў адзін і той жа дзяржаўны орган (арганізацыю), адной і той жа службовай асобе, без дэкларавання гэтай маёмасці.

**Артыкул 7. Дэклараванне даходаў і маёмасці няпоўнагадовых, а таксама асобаў, якія абмежаваныя судом у дзеяздольнасці і прызнаныя судом недзеяздольнымі**

Дэклараванне даходаў і маёмасці:

няпоўнагадовых ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў (малалетніх) ажыццяўляецца іх законнымі прадстаўнікамі (бацькамі, усынавіцелямі (удачарыцелямі) або апекунамі);

няпоўнагадовых ва ўзросце ад чатырнаццаці да васемнаццаці гадоў, за выключэннем асобаў, якія набылі дзеяздольнасць у поўным аб'ёме ў выніку эмансіпацыі або заключэння шлюбу, ажыццяўляецца гэтымі асобамі з пісьмовай згоды іх законных прадстаўнікоў (бацькоў, усынавіцеляў (удачарыцеляў) або апекуноў);

асобаў, абмежаваных судом у дзеяздольнасці, ажыццяўляецца гэтымі асобамі са згоды іх апекуноў;

асобаў, прызнаных судом недзеяздольнымі, ажыццяўляецца іх апекунамі.

**Артыкул 8. Дэклараванне даходаў і маёмасці пры паступленні на службу**

Калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, дэкларацыю аб даходах і маёмасці ў адпаведны дзяржаўны орган (арганізацыю) абавязаны падаваць асобы, якія паступаюць на дзяржаўную службу, а таксама на ваенную службу па кантракце, службу ў органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях, органы ўнутраных спраў і органы фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 9. Дэклараванне даходаў і маёмасці пры прызначэнні на пэўныя пасады**

Калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, дэкларацыю аб даходах і маёмасці абавязаны падаваць у адпаведны дзяржаўны орган (арганізацыю):

асобы, якія прызначаюцца на пасады кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый;

асобы, якія прызначаюцца на пасады кіраўнікоў недзяржаўных сельскагаспадарчых арганізацый, калі з імі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі абавязкова заключаюцца кантракты;

дзяржаўныя служачыя — пры займанні іншай дзяржаўнай пасады;

вайскоўцы — пры прызначэнні на вайсковыя пасады намеснікаў кіраўнікоў дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў падраздзяленняў цэнтральнага апарату дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, і падпарадкаваных ім органаў, галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, а таксама на пасады камандзіраў вайсковых часцей, злучэнняў, кіраўнікоў органаў ваеннага ўпраўлення і арганізацый Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў Рэспублікі Беларусь і іх намеснікаў;

супрацоўнікі органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях — пры прызначэнні на пасады кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў падраздзяленняў цэнтральнага апарату Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў тэрытарыяльных органаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях з правамі юрыдычнай асобы, а таксама на пасады старшага, сярэдняга і малодшага начальніцкага складу органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны пажарны нагляд і дзяржаўны нагляд і кантроль у галіне абароны насельніцтва і тэрыторый ад надзвычайных сітуацый;

супрацоўнікі органаў унутраных спраў — пры прызначэнні на пасады кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў падраздзяленняў цэнтральнага апарату Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў тэрытарыяльных органаў унутраных спраў, іх падраздзяленняў, а таксама на пасады старшага, сярэдняга і малодшага начальніцкага складу тэрытарыяльных органаў унутраных спраў;

супрацоўнікі органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь — пры прызначэнні на іншую пасаду ў органах фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 10. Штогадовае дэклараванне даходаў і маёмасці**

Штогадовае дэклараванне даходаў і маёмасці дзяржаўных служачых, іх мужа (жонкі) і поўнагадовых блізкіх сваякоў, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным гэтым Законам, з улікам асаблівасцяў, прадугледжаных Законам Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2003 года «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 70, 2/953).

Штогадовае дэклараванне даходаў і маёмасці асобаў, пасады якіх уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, якія не з'яўляюцца дзяржаўнымі служачымі, іх мужа (жонкі) і поўнагадовых блізкіх сваякоў, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным гэтым Законам, з улікам асаблівасцяў, прадугледжаных Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» для асобаў, прызначаных на дзяржаўныя пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь.

Кіраўнікі дзяржаўных арганізацый, за выключэннем названых у частках першай і другой гэтага артыкула, іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаны штогод падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці кіраўнікам дзяржаўных органаў, іншых дзяржаўных арганізацый, якія прызначылі гэтых кіраўнікоў арганізацый на пасады.

Кіраўнікі недзяржаўных сельскагаспадарчых арганізацый, калі з імі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі абавязкова заключаюцца кантракты, іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаны штогод падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці старшыням адпаведных гарадскіх або раённых выканаўчых камітэтаў.

Вайскоўцы органаў пагранічнай службы, якія займаюць воінскія пасады ў Дзяржаўным пагранічным камітэце Рэспублікі Беларусь, а таксама вайскоўцы, якія займаюць воінскія пасады кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў падраздзяленняў цэнтральнага апарату дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, і падпарадкаваных ім органаў, галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (за выключэннем асобаў, прызначаных на вышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь), іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаны штогод падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці адпаведна кіраўнікам дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, і падпарадкаваных ім органаў, намесніку Міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь — камандуючаму ўнутранымі войскамі, начальніку Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Вайскоўцы, якія займаюць воінскія пасады камандзіраў вайсковых часцей, злучэнняў, кіраўнікоў органаў ваеннага кіравання і арганізацый Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў Рэспублікі Беларусь і іх намеснікаў (за выключэннем асобаў, прызначаных на вышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь), іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаны штогод падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці непасрэдным камандзірам (начальнікам).

Вайскоўцы органаў пагранічнай службы, якія праходзяць ваенную службу па кантракце на пасадах афіцэраў і прапаршчыкаў (за выключэннем вайскоўцаў, указаных у частках пятай і шостай гэтага артыкула, і асобаў, прызначаных на вышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь), іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаны штогод падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці камандзіру вайсковай часці органаў пагранічнай службы.

Супрацоўнікі органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, якія займаюць пасады кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў падраздзяленняў цэнтральнага апарату Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, кіраўнікоў і намеснікаў кіраўнікоў тэрытарыяльных органаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях з правамі юрыдычнай асобы, а таксама займаюць пасады старшага, сярэдняга і малодшага начальніцкага складу органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны пажарны нагляд і дзяржаўны нагляд і кантроль у галіне абароны насельніцтва і тэрыторый ад надзвычайных сітуацый (за выключэннем асобаў, прызначаных на вышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь), іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаны штогод падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці адпаведна кіраўніку (начальніку) органа або падраздзялення па надзвычайных сітуацыях.

Супрацоўнікі органаў унутраных спраў, якія займаюць пасады старшага і сярэдняга начальніцкага складу органаў унутраных спраў (за выключэннем асобаў, прызначаных на вышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь), іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаны штогод падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці кіраўніку (начальніку) адпаведнага органа ўнутраных спраў.

Супрацоўнікі органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь (за выключэннем асобаў, прызначаных на вышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь), іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаны штогод падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Дэкларацыі аб даходах і маёмасці падаюцца штогод да 1 сакавіка.

У выпадку непадачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці (непадачы ў тэрмін, адмаўлення ў падачы) мужам (жонкай) і (або) поўнагадовымі блізкімі сваякамі, якія сумесна пражываюць і вядуць агульную гаспадарку з асобай, абавязанай штогод падаваць дэкларацыю аб даходах і маёмасці, гэта асоба пісьмова паведамляе аб непадачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці яго мужам (жонкай) і (або) поўнагадовымі блізкімі сваякамі з указаннем прычын іх непадачы. Пры гэтым асобы, якім штогод падаюцца дэкларацыі аб даходах і маёмасці, прымаюць рашэнне аб выпатрабаванні праз падатковыя органы дэкларацый аб даходах і маёмасці мужа (жонкі) і (або) поўнагадовых блізкіх сваякоў, якія сумесна пражываюць і вядуць агульную гаспадарку з асобай, абавязанай штогод падаваць дэкларацыю аб даходах і маёмасці, і накіроўваюць адпаведны запыт.

Фізічная асоба, муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі якой абавязаны ў адпаведнасці з гэтым артыкулам штогод падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці, самастойна вызначае з іх колькасці тых асобаў, якія сумесна з ёй пражываюць і вядуць агульную гаспадарку.

Пры неабходнасці па матываваным запыце асобаў, якім штогод падаюцца дэкларацыі аб даходах і маёмасці, падатковымі органамі могуць быць запатрабаваныя дэкларацыі аб даходах і маёмасці ад поўнагадовых блізкіх сваякоў асобаў, абавязаных у адпаведнасці з гэтым артыкулам падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці, якія сумесна з імі не пражываюць і (або) не вядуць агульную гаспадарку, але не часцей за адзін раз у год.

Падатковы орган накіроўвае пададзеныя па яго патрабаванні дэкларацыі аб даходах і маёмасці асобам, якія прынялі рашэнне аб выпатрабаванні дэкларацый аб даходах і маёмасці і накіравалі запыт аб выпатрабаванні гэтых дэкларацый.

**Артыкул 11. Дэклараванне даходаў і маёмасці пры фарміраванні звестак аб кандыдатах на пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь**

Кандыдаты на пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаны падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці ў дзяржаўныя органы, якія фарміруюць звесткі аб такіх кандыдатах.

**Артыкул 12. Дэклараванне даходаў і маёмасці па патрабаванні падатковых органаў**

Дэклараванне даходаў і маёмасці можа ажыццяўляцца шляхам падачы фізічнымі асобамі дэкларацый аб даходах і маёмасці па пісьмовым патрабаванні падатковых органаў, у тым ліку па патрабаванні, якое прад'яўляецца на падставе пісьмовага запыту органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў, органаў дзяржаўнай бяспекі і пракуратуры.

Пісьмовае патрабаванне аб падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці маюць права прад'яўляць ад імя падатковых органаў Міністр па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь і яго намеснікі, начальнікі тэрытарыяльных падатковых органаў і іх намеснікі.

Пісьмовы запыт аб выпатрабаванні дэкларацыі аб даходах і маёмасці ў падатковы орган маюць права накіроўваць ад імя:

органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь — Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і яго намеснікі, начальнікі галоўных упраўленняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і іх намеснікі, старшыні камітэтаў дзяржаўнага кантролю абласцей і іх намеснікі, начальнікі органаў фінансавых расследаванняў і іх намеснікі, старшыні міжраённых камітэтаў дзяржаўнага кантролю і асобы, якія іх замяшчаюць;

органаў унутраных спраў — Міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь і яго намеснікі, начальнікі галоўных упраўленняў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і іх намеснікі, начальнікі тэрытарыяльных органаў унутраных спраў і іх намеснікі;

органаў дзяржаўнай бяспекі — начальнікі органаў дзяржаўнай бяспекі і іх намеснікі, начальнікі галоўных упраўленняў органаў дзяржаўнай бяспекі і іх намеснікі;

органаў пракуратуры — Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь і яго намеснікі, пракуроры абласцей, горада Мінска, раёнаў, раёнаў у гарадах, гарадоў, прыраўнаваныя да іх пракуроры і іх намеснікі, начальнікі ўпраўленняў Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

Падатковыя органы маюць права патрабаваць падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці за поўны каляндарны год або некалькі поўных каляндарных гадоў, але не больш чым за дзесяць поўных каляндарных гадоў, што папярэднічаюць году, у якім накіроўваецца пісьмовае патрабаванне.

Пісьмовае патрабаванне аб падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці складаецца ў двух экземплярах. Першы экземпляр пісьмовага патрабавання ўручаецца фізічнай асобе асабіста пад роспіс або накіроўваецца па пошце заказным пісьмом з паведамленнем аб уручэнні. Другі экземпляр пісьмовага патрабавання захоўваецца ў падатковым органе, які выпатрабаваў дэкларацыю аб даходах і маёмасці.

Дэкларацыя аб даходах і маёмасці падаецца ў тэрмін, вызначаны ў пісьмовым патрабаванні, які не можа быць меншым за дзесяць працоўных дзён, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь або нарматыўнымі прававымі актамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У выпадку немагчымасці падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці ў вызначаны тэрмін фізічная асоба абавязана не пазней чым за тры каляндарныя дні да надыходу ўказанага ў пісьмовым патрабаванні тэрміну падаць у падатковы орган, які выпатрабаваў дэкларацыю, заяву з указаннем прычын яе непадачы. У заяве таксама ўказваецца тэрмін (які вызначаецца каляндарнай датай) падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці.

Службовая асоба падатковага органа, які выпатрабаваў дэкларацыю аб даходах і маёмасці, пісьмова паведамляе фізічнай асобе аб прадаўжэнні тэрміну падачы дэкларацыі або робіць адзнаку аб такім прадаўжэнні на двух экземплярах пісьмовага патрабавання. Пры гэтым тэрмін падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці можа быць прадоўжаны не больш чым на тры месяцы з дня атрымання фізічнай асобай пісьмовага патрабавання аб яе падачы.

Дэкларацыя аб даходах і маёмасці можа быць пададзена фізічнай асобай асабіста, праз свайго ўпаўнаважанага прадстаўніка або па пошце. Пры накіраванні дэкларацыі аб даходах і маёмасці па пошце днём яе падачы з'яўляецца дата паштовага адпраўлення.

**Артыкул 13. Форма дэкларацыі аб даходах і маёмасці і парадак яе запаўнення**

Дэкларацыя аб даходах і маёмасці падаецца па форме, устаноўленай Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай другой гэтага артыкула.

Кандыдаты на пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, а таксама асобы, якія займаюць пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, падаюць дэкларацыі аб даходах і маёмасці па форме, устаноўленай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Расходы на выраб бланкаў, неабходных для дэкларавання даходаў і маёмасці, ажыццяўляюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Бланкі дэкларацыі аб даходах і маёмасці выдаюцца дзяржаўным органам (арганізацыяй), у які (якую) падаецца дэкларацыя аб даходах і маёмасці, або падатковым органам, які выпатрабаваў дэкларацыю, бясплатна.

Парадак запаўнення дэкларацыі аб даходах і маёмасці вызначаецца Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 14. Правы і абавязкі фізічных асобаў пры дэклараванні даходаў і маёмасці**

Фізічныя асобы маюць права на:

атрыманне ў дзяржаўным органе (арганізацыі), у які (якую) падаецца дэкларацыя аб даходах і маёмасці, або ў адпаведнай службовай асобы падатковага органа, які выпатрабаваў дэкларацыю аб даходах і маёмасці, бясплатнай кансультацыі аб форме і змесце дакументаў, якія падаюцца, і парадку запаўнення ўказанай дэкларацыі;

прадстаўленне сваіх інтарэсаў у дзяржаўных органах (арганізацыях), у тым ліку падатковых органах, самастойна або праз свайго ўпаўнаважанага прадстаўніка;

атрыманне ў арганізацыях і ў індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца крыніцай выдачы (выплаты) даходу, даведкі аб сумах выдадзенага (выплачанага) даходу, у тым ліку аб кошце перададзенай маёмасці;

кампенсацыю стратаў (шкоды), нанесеных ім невыкананнем або неналежным выкананнем службовымі асобамі дзяржаўных органаў (арганізацый), у тым ліку падатковых органаў, абавязкаў, вызначаных гэтым Законам.

Фізічныя асобы абавязаны:

падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці ў парадку, вызначаным актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

па пісьмовым патрабаванні падатковых органаў падаваць тлумачэнні аб крыніцах даходаў у тэрмін, вызначаны часткай шостай артыкула 15 гэтага Закона.

Фізічным асобам забараняецца перашкаджаць службовым асобам дзяржаўных органаў (арганізацый), у тым ліку падатковых органаў, пры правядзенні імі праверкі паўнаты і дакладнасці звестак, указаных у дэкларацыі аб даходах і маёмасці і ў тлумачэннях аб крыніцах даходаў.

**Артыкул 15. Кантроль у сферы дэкларавання даходаў і маёмасці**

Падатковыя органы, іншыя дзяржаўныя органы (арганізацыі), у якія падаюцца дэкларацыі аб даходах і маёмасці, ажыццяўляюць кантроль за выкананнем парадку дэкларавання, у тым ліку за паўнатой і дакладнасцю звестак, указаных у дэкларацыях аб даходах і маёмасці.

Праверка і захоўванне дэкларацый аб даходах і маёмасці, якія падаюцца кандыдатамі на пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, а таксама асобамі, якія займаюць пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Кіраўніка Дзяржавы Рэспублікі Беларусь, іх мужам (жонкай) і поўнагадовымі блізкімі сваякамі, якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Праверка і захоўванне дэкларацый аб даходах і маёмасці, якія падаюцца ў адпаведнасці з артыкуламі 8, 9 і 10 гэтага Закона, ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Праверка і захоўванне дэкларацый аб даходах і маёмасці, выпатрабаваных падатковымі органамі, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Падатковыя органы ажыццяўляюць кантроль за адпаведнасцю расходаў фізічнай асобы даходам, заяўленым у дэкларацыі аб даходах і маёмасці, пададзенай па патрабаванні падатковых органаў. Супастаўленне сум расходаў і даходаў фізічнай асобы, якая падала дэкларацыю аб даходах і маёмасці, праводзіцца на падставе звестак, указаных гэтай асобай у дэкларацыі аб даходах і маёмасці, і інфармацыі, якая ёсць у падатковым органе.

Калі падатковым органам пры ажыццяўленні кантролю за адпаведнасцю расходаў фізічнай асобы даходам, заяўленым у дэкларацыі аб даходах і маёмасці, пададзенай па патрабаванні падатковых органаў, вызначана, што расходы фізічнай асобы перавышаюць яе даходы, указаныя ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці, або факт атрымання даходу не пацвярджаецца, то гэты падатковы орган накіроўвае фізічнай асобе пісьмовае патрабаванне аб дачы тлумачэння аб крыніцах даходаў. Тлумачэнні ў пісьмовай форме павінны быць пададзены фізічнай асобай у падатковы орган на працягу трыццаці каляндарных дзён з дня ўручэння пісьмовага патрабавання.

Калі фізічнай асобай не пададзены тлумачэнні аб крыніцах даходаў у выпадках і парадку, прадугледжаных часткай шостай гэтага артыкула, або калі пададзеныя тлумачэнні не дазваляюць вызначыць крыніцу даходаў, даходы фізічнай асобы, падлічаныя зыходзячы з сум перавышэння расходаў над даходамі, падлягаюць падаткаабкладанню ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Іншыя дзяржаўныя органы (арганізацыі), якія ажыццяўляюць у адпаведнасці з гэтым Законам кантроль за выкананнем парадку дэкларавання, пры выяўленні ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці няпоўных і (або) недакладных звестак на працягу пятнаццаці каляндарных дзён з дня ўстанаўлення такога факта накіроўваюць аб гэтым паведамленне ў падатковы орган па месцы жыхарства фізічнай асобы, а таксама завераныя кіраўніком або яго намеснікам копіі дэкларацыі аб даходах і маёмасці і іншых дакументаў, якія пацвярджаюць устаноўлены факт, у мэтах прыцягнення такой асобы да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 16. Адказнасць за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб дэклараванні даходаў і маёмасці**

Асобы, вінаватыя ў парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб дэклараванні даходаў і маёмасці, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Адказнасць за непадачу дэкларацыі аб даходах і маёмасці мужам (жонкай) поўнагадовым блізкім сваяком асобы, абавязанай у адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь падаваць дэкларацыю аб даходах і маёмасці, за ўказанне імі ў дэкларацыі няпоўных і (або) недакладных звестак, парушэнне імі парадку падачы дэкларацыі нясуць муж (жонка), поўнагадовы блізкі сваяк указанай асобы.

Прымяненне да фізічнай асобы мераў адказнасці за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб дэклараванні даходаў і маёмасці не вызваляе яе ад абавязку падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці.

У выпадку выяўлення фізічнай асобай у пададзенай ёю дэкларацыі аб даходах і маёмасці няпоўных і (або) недакладных звестак да іх выяўлення дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі), у тым ліку падатковымі органамі, якія праводзяць праверку паўнаты і дакладнасці звестак, указаных у дэкларацыі, гэта асоба мае права заявіць аб гэтым у адпаведны дзяржаўны орган (арганізацыю), у тым ліку падатковы орган, і падаць удакладненую дэкларацыю. Пры гэтым фізічная асоба вызваляецца ад адказнасці за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб дэклараванні даходаў і маёмасці.

Асобы, якія дапусцілі выдаванне звестак аб даходах і маёмасці, а таксама звестак, якія ўтрымліваюцца ў тлумачэнні аб крыніцах даходаў, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.».

**Артыкул 2.** З частак першай і трэцяй артыкула 19 Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2006 года «Аб барацьбе з карупцыяй» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 122, 2/1262) словы «і аб крыніцах грашовых сродкаў» выключыць.

**Артыкул 3.** З абзаца чацвёртага пункта 1 артыкула 27 Закона Рэспублікі Беларусь ад 8 мая 2007 года «Аб пракуратуры Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 119, 2/1317) словы «, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, выпатрабаваць ад іх дэкларацыі аб даходах і маёмасці» выключыць.

**Артыкул 4.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін:

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 5.** Гэты Закон уваходзіць у сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 4, якія ўваходзяць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА**
*3 снежня 2009 года, г. Мінск.*
*№ 64—З*

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:**
**21 декабря 2009 г. в 10.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 состоится ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего ликвидируемому предприятию ОАО «Весоприбор», в составе следующих лотов:**

| | |
|---|---|
| Лот № 1 | **Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе:**<br>- кап. строение с инв. № 710/С-58314 (здание цеха сварных конструкций) пл. 2039,1 кв.м, с сооруж.: забор (ж/бет) пл. 28 м², забор (ж./бет.) пл. 113 м², забор (кирпич) пл. 87 м², ворота (метал) пл. 15 м², мощение (бетон) пл. 221 м²;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54309 (здание склада ГСМ-2) общей площадью 12,4 кв.м;<br>- кап. строения с инв. № 710/С-54311 (канализационная сеть);<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54310 (водопроводная сеть) протяженностью 23,1 м;<br>**- в том числе:** оборудование КТП 10/04-1 х 630 (инв. № 1589), кран-балка г/п 3 т (инв. №№ 752, 753, 782, 783), таль эл. г/п 2 т (инв № 1593), таль эл. г/п 3,2 т (инв. № 1594), таль эл. г/п 5 т (инв №№ 1866, 1867). |
| Лот № 2 | **Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе:**<br>- кап. строение с инв. № 710/С-58317 (здание заготовительно-штамповочного цеха) пл. 1148,9 кв.м, с сооруж.: забор (ж/бет.) пл. 12 м², забор (кирп) пл. 135 м², забор (метал. сетка) пл. 92 м², ворота (метал) пл. 11 м², калитка (метал) пл. 2 м2, мощение (асф/бет) пл. 326,75 м²; пути подкрановые;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-51530 (здание склада ГСМ) общей площадью 118,1 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54307 (здание склада) общ. пл. 81,6 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54308 (здание цеха голтовки) общ. пл. 111,7 кв.м;<br>- кап. строение с инв. № 710/С-54306 (здание трансформаторной подстанции) общ. пл. 30,1 кв.м;<br>**- в том числе:** оборудование КТП 10/04-1 х 400 (инв. № 62), кран-балка г/п 3 т (инв. №№ 184а, 199, 191а), кран-балка г/п 5 т (инв № 485), таль эл. г/п 5 т (инв №№ 1222, 1223), кран-укосина г/п 0,5 т (инв. № 1010). |
| Лот № 3 | **Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе:**<br>- кап. строение с инв. № 710/С-51527 (здание межцехового склада) пл. 516 кв.м, с сооруж.: забор (кирп.) пл. 38 м², мощение (асф/бет) пл. 327 м²; **в том числе:** таль эл. г/п 5 т (инв № 1035). |
| Лот № 4 | **Кап. строение с инв. № 710/С-41497 (здание склада материалов и оборуд.) пл. 1 959,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2,** с сооруж.: подкран. эстак. пл. 656 м², забор (кирп.) пл. 187 м², мощение (асф./бет.) пл. 654 м². |

| Общие сведения | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 | Лот № 4 |
|---|---|---|---|---|
| Организатор торгов | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 | | | |
| Начальная цена продажи, рублей без НДС | 574 859 240 | 448 729 327 | 135 666 058 | 404 649 941 |
| Размер задатка, рублей | 57 485 920 | 44 872 930 | 13 566 610 | 40 464 990 |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Весоприбор» – р/с 3012000002968 в филиале 703 ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700090810 | | | |
| Площадь земельного участка | **323/400 доли** земельного участка площадью **0,5106 га** – кадастровый № 741000000009001750, правовой режим – аренда | **0,3418 га, в т.ч.:** 0,3365 га – кадастровый № 741000000009001751 и 0,0053 га – кадастровый № 741000000009001746, правовой режим – пост. пользование | **0,1051 га –** кадастровый № 741000000009001752, правовой режим – пост. пользование | **0,2399 га –** кадастровый № 741000000009001753, правовой режим – пост. пользование |
| Условия продажи | аукцион без условий | | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | | |
| Условия оплаты | определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи | | | |
| Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка | | | по 18 декабря 2009 г. включительно | |

***Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» № 162 (26520) от 29 августа 2009 г.**

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

